**Гульня –конкурс «Знаўцы роднай мовы»**

***Мэты:***

- спрыяць фарміраванню станоўчай матывацыі да вывучэння роднай мовы і літаратуры;
- скласці ўмовы для высвятлення каманды-пераможцы ў віктарыне;
- садзейнічаць развіццю ўвагі да роднага слова, славесна-лагічнай памяці, мыслення;
- фарміраваць культуру зносін;
- спрыяць выхаванню патрыятычных пачуццяў.

**Абсталяванне:** прэзентацыя, слоўнікі, аркушы для малявання, рознакаляровая папера, рознакаляровыя алоўкі, клей.

**Ход мерапрыемства**

Гучыць мелодыя песні «Родная мова» (муз. А. Кацікава).

**Настаўнік.** Я вельмі рада бачыць вас і з вялікім задавальненнем запрашаю на «Свята роднай мовы»! *(Чытае вершаваныя радкі Г. Пашкова.)*

Самы радасны прадмет –
Спасцігаць загадку слова,
роднае зямелькі мову
на ўроку,
у жыцці,
каб лягчэй было ісці
і каб сілу мець душою
праз жыццё –
за годам год, -
што зямля твая –
з табою,

што з табою –

твой народ!

**Настаўнік.** Мы — беларусы. Нас называюць памяркоўнымі, гасціннымі, шчырымі людзьмі. Беларусы вылучаюцца сваёй знешнасцю (светлыя, ільняныя валасы, блакітныя вочы), ветлівай усмешкай на вуснах і мілагучнай, напеўнай мовай. Сёння 21 лютага. Гэта незвычайны зімовы дзень. У 1999 годзе па рашэнні ЮНЕСКА ён быў абвешчаны Міжнародным днём роднай мовы. Дзень роднай мовы асаблівы для кожнай нацыі, кожнага народа, бо няма народа без мовы, няма мовы без носьбіта.

Прапаную вам гульню, у ходзе якой вы зможаце ўзбагаціць свае веды пра мову, прадэманстраваць, што вам ужо вядома. У гульні прымаюць удзел тры каманды. За кожнае правільна выкананае заданне каманда атрымае кветку. Пастарайцеся сабраць вялікі букет для нашай мовы ў дзень яе свята.

**І заданне. Конкурс капітанаў “Кінастужка”**

Запішы словы па-беларуску:

<table>
<tr><td colspan="4">пора</td><td colspan="5">солнце</td><td colspan="5">рыцарь</td><td colspan="5">осока</td><td colspan="3">гумно</td></tr>
<tr><td></td><td></td><td></td><td></td><td></td><td></td><td></td><td></td><td></td><td></td><td></td><td></td><td></td><td></td><td></td><td></td><td></td><td></td><td></td><td></td><td></td><td></td></tr>
<tr><td colspan="7">зонт</td><td colspan="6">царица</td><td colspan="4">роса</td><td colspan="5">котик</td></tr>
</table>

**ІІ заданне. Размінка “Загадкі”**

Перш чым адправіцца ў падарожжа, правядзем невялічкую размінку – будзем адгадваць загадкі і праверым вашу гатоўнасць да сур’ёзнай вандроўкі.

**“Далей, далей, далей …”**

За 1хвіліну каманды павінны адгадаць як мага болей загадак

**ЗАГАДКІ:**

1.З высокай дарогі глядзіць бычок крутарогі (Месяц)

2.Што нас корміць, а есці не просіць (Зямля)

3.Стукае, грукае, а нідзе не відаць (Гром)

4.Прыйшла белая кабылая і ўвесь свет абяліла (Зіма)

5.Чаму шапку купляюць (Дарма не даюць)

6.У адным бачочку 7 дзірачак (Галава)

7.Ляжыць калода сярод балота, ні гніе, ні сохне (Язык)

8.Еду, еду – няма следу, адгадай на чым я еду (На лодцы)

9.Пасярод двара стаіць гара: спераду вілы, ззаду мятла (Карова)

10. Лёг вусаты, а ўстаў гарбаты (Кот)

11. Хто мяне заб’е, той сваю кроў пралье (Камар)

12. Не куст, а з лісточкамі, не кашуля, а пашыта (Кніга)

13. Сядзіць Пахом на кані вярхом, сам непісьменны, а чытаць памагае (Акуляры)

14. Што расце без кораня ( Камень)

15. Чаму ў Парыжы Сена не сохне (Рака)

16. Глянеш – заплачаш, а ўсе яму рады (Сонца)

17. Кругом вада, а з піццём бяда. Хто адгадае, дзе гэта бывае (На моры)

18. Без рук, без ног, а вароты адчыняе (Вецер)

19. Ляцяць птушкі без крыл, а садзяцца без ног (Сняжынкі)

20. 12 арлоў, 52 галкі знеслі 1 яйцо (12 месяцаў, 52 тыдні, 1 год)

Настаўнік : Зараз прапаную вам гульню, у ходзе якой вы зможаце ўзбагаціць свае веды пра мову, прадэманстраваць, што вам ужо вядома. У гульні прымаюць удзел тры каманды. За кожнае правільна выкананае заданне каманда атрымае кветку. Пастарайцеся сабраць вялікі букет для нашай мовы ў дзень яе свята.

**III заданне.** Падбярыце слова, словазлучэнне, якім можна ахарактарызаваць, апісаць нашу мову. Для мяне беларуская мова — пяшчотная. А якая яна для вас?

*Настаўнік перадае па крузе кветку, і вучні па чарзе агучваюць свае словы, словазлучэнні.*

**Прыкладныя адказы:** прыгожая, напеўная, мілагучная, вобразная,

сакавітая, сонечная, дарагая, бацькоўская, звонкая, непаўторная, адзіная ў свеце, ласкавая, любімая, мілая, узнёслая, магутная...

**Настаўнік:** Малайцы! Вы адчуваеце, як адразу стала святлей ад такіх цёплых слоў.*Каманды атрымоўваць свае першыя кветкі ў букет для мовы.*

**IV. Паэтычны прыпынак**

Настаўнік: А цяпер хвілінка творчасці. Беларуская мова заслугоўвае таго, каб на яе адрас гаварылі самыя шчырыя, пяшчотныя словы, каб ёй прысвячалі вершы. Ваша задача скласці сінквейн на тэму «Мова».

**МОВА**

Прыметнік, прыметнік.

Дзеяслоў, дзеяслоў, дзеяслоў.

Гэта – …

Назоўнік.

**V. Заданне. Спяшайся бачыць**

Настаўнік: Ваша задача як мага хутчэй і больш знайсці “схаваных” слоў.

**Адшукай як мага больш слоў:**

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| **к** | **а** | **м** | **і** | **з** | **э** |
| **а** | **ф** | **а** | **г** | **а** | **л** |
| **ш** | **у** | **л** | **я** | **ш** | **ь** |
| **а** | **т** | **а** | **н** | **т** | **к** |
| **л** | **р** | **а** | **к** | **у** | **а** |
| **і** | **ш** | **э** | **а** | **к** | **с** |
| **к** | **ь** | **н** | **м** | **ю** | **ц** |

**VI. Заданне.** Прыпынак “Знаўцы беларускіх фразеалагізмаў»

Настаўнік: Ваша задача спалучыць фразеалагізмы з тлучачэннем іх значэння.

1. **Спалучы фразеалагізмы з тлумачэннем значэння.**

| | |
|---|---|
| ✓ *Карміць абяцанкамі*<br>✓ *Біцца як рыба аб лёд*<br>✓ *Ваду ў ступе таўчы*<br>✓ *Навастрыць вушы*<br>✓ *Галопам па еўропах*<br>✓ *Закручваць гайкі*<br>✓ *З лёгкім сэрцам* | ✓ *Без трывогі і апаскі, без роздуму*<br>✓ *Напружана, уважліва прыслухоўвацца, насцярожвацца*<br>✓ *Абяцаць зрабіць што-небудзь у хуткім часе і не выконваць абяцанага*<br>✓ *Павышаць патрабаванні, узмацняць строгасць*<br>✓ *Марнаваць час, займацца бескарыснай справай (весці пустыя размовы, пустасловіць)*<br>✓ *Павярхоўна, не сур'ёзна, не ўдаючыся ў дэталі*<br>✓ *Без выніку і плёну намагацца, старацца, дабівацца чаго-небудзь* |

**Настаўнік.** Міжнародны дзень роднай мовы — гэта свята, асаблівая падзея. Можна лічыць мову імянінніцай. У такія святы звычайна віншуюць імяніннікаў прыгожымі паштоўкамі са словамі пажадання. Давайце і мы гэта зробім.

**V заданне.** Аформіце паштоўку і выкажыце пажаданні беларускай мове.

У час выканання задання гучыць песня «Ветлівыя словы». *Каманды прэзентуюць свае паштоўкі.*

Віншавальная паштоўка.

**Настаўнік.** Сябры, вы сабралі цудоўныя букеты для нашай мовы. Дзякую вам за гэта. Спадзяюся: шчырыя, сардэчныя і цёплыя словы беларускай мовы будуць гучаць з вашых вуснаў і ўпрыгожваць жыццё. Дык давайце будзем берагчы яе, вывучаць і карыстацца ёю. Хай заўсёды гучыць мова роднай зямлі, мова беларускага народа.

Дзякуем усім за добрую гульню, за вашы веды! Да новых сустрэч!